**А. І. БЕЛЬСКІ,**
доктар філалагічных навук,
прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

# СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА Ў ПРОЗЕ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

*Заканчэнне. Пачатак у № 11 за 2014 г.*

Кузьма Чорны пільна ўзіраецца ў сваіх малых і юных герояў ды хоча спазнаць іх існасць, у кожным канкрэтным выпадку зразумець, які ён, гэты недарослы чалавек, што ён сабой уяўляе, чым поўніцца ягоны ўнутраны свет. Шмат аўтабіяграфічнага ці жыццёвага матэрыялу, пачэрпнутага з мястэчковага жыцця, у раманнай прозе Кузьмы Чорнага. Многія сцэны і дзіцячыя вобразы ў рамане Кузьмы Чорнага **«Зямля»** (1928) нібы ўзяты з рэальнага жыцця. Аўтар прысвяціў твор свайму малодшаму брату Юрасю Рамаscore ноўскаму. Гэтае імя для пісьменніка было адным з улюбёных. Яго брат, на вялікі жаль, пражыў нядоўгае жыццё: ён загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны. Кузьма Чорны ў гады барацьбы з фашысцкай навалай надзвычай хваляваўся пра Юрася, як і пра другога брата — Міхася, сваіх сясцёр Машу і Ганну. «Дзе Юрась? Божа мілы, дзе Юрась?» — усім сэрцам непакоіцца герой апавядання «Бацька», якое было напісана ў 1942 годзе. У ваенным рамане пісьменніка «Пошукі будучыні» з'яўляецца вобраз Юрася Нявады. Яго імя зноў нагадвае нам пра брата пісьменніка. С. Александровіч, маючы на ўвазе аповесць «Скіп'ёўскі лес», адзначае, што «ў Кастуся Прыбыткоўскага многа агульнага з жыццёвым лёсам малодшага брата Кузьмы Чорнага Юрася» [2, с. 249]. Такім чынам, Юрась Раманоўскі стаў прататыпным героем у шэрагу твораў Кузьмы Чорнага. Раман «Зямля» — гэта, апрача іншага, элегія-ўспамін пра дзяцінства, твор пра сталенне новага пакалення сялянскіх дзяцей. У сістэме персанажаў, бадай, самае прыкметнае і адметнае месца належыць вобразу Юркі. Гэта яшчэ зусім невялікі хлопчык-падлетак, які на пытанне «Колькі табе год цяпер?» адказвае: «Я добра не ведаю, здаецца, дванаццаць — трынаццаты». Пісьменнік стварае запамінальны партрэт гэтага героя — як вонкавы, так і ўнутраны, псіхалагічны. На холадзе ў беднай вопратцы Юркаварты жалю. Аўтар заўважае, што яго «кажушок выліняў, голы, як бубен», да таго ж кажушок без каўняра. Празаік падкрэслівае ў гэтым дзіцячым вобразе адсутнасць фізічнай моцы, па сутнасці перад намі невялікае дзіця, якому яшчэ сталець і сталець: «Пад кажухом Юрка быў тоненькі і кволы»; «Юрка сваім дзіцячым голасам, тонкім і няроўным, адварочваў коні»; «Шчуплы Юрка ліпеў на худым сваім кані, падкурчыўшы ногі» і інш. І душой ён яшчэ неакрэплы, вельмі чуллівы і ранімы. Юрка «свядома разумеў сэрцам» — разумеў, дзе праўда, а дзе хлусня, дзе чалавечая бяда-гора, а дзе дабрыня, спагада. У сваёй шчырасці ён адкрыты жыццю і людзям, надзвычай глыбока прымае ў сэрца крыўду, горыч і боль. Даведаўшыся пра хваробу маці, хлопчык хвалюецца, шкадуе яе, але асабліва моцна яго ўзрушвае смерць роднага чалавека: «У Юркі раптам нешта сціснула за горла, дыхаць стала цяжка. Страшная здагадка шавяльнулася ў ім»; «У хаце Юрка не адыходзіў ад мацеры і не мог выплакаць усіх слёз сваіх. З самага ранку ён усё стаяў тут, калаціўся ў немай роспачы, і несупынныя слёзы яго былі то ціхімі, то бурнымі». Страту маці хлопчык перажывае вельмі балюча, для яго гэта найвялікшая трагедыя. Заўчасную смерць маці Гліцэры Міхайлаўны перажыў і Кузьма Чорны, яго малодшыя браты і сёстры. Безумоўна, у рамане малады на той час пісьменнік імкнуўся глыбока перадаць свой эмацыянальны стан і дзіцячыя адчуванні брата Юркі, якія выклікала страшэннае гора (яму на момант смерці маці было прыкладна столькі ж гадоў, колькі і аднайменнаму герою твора). Пісьменнік паказвае, што

смерць маці — цяжкае выпрабаванне для сям'і, дзяцей. Асабліва добра разумеюць усю глыбіню жыццёвай трагедыі жанчыны-суседкі, якія збіраюць нябожчыцу ў апошні шлях. «Ужывуць небаракі-дзеці гора без маткі», — так кажа адна з іх. Душэўныя пакуты не пакідаюць Юрку, самотныя ўспаміны і жаль вярэдзяць яго сэрца. У жыццёвым светаладзе Кузьма Чорны вылучае надзвычай важныя, па сутнасці хрысціянскія каштоўнасці — спачуванне і шкадаванне, шчырая душэўная падтрымка ў хвіліну чалавечага гора і смутку. Чулая ўвага, цёплае сардэчнае слова і суцяшэнне асабліва патрэбны дзіцяці, у якога смерць маці спараджае псіхалагічную траўму. Гэта пісьменнік добра паказаў праз стасункі старога Тамаша і Юркі:

— Ты, сынку, з старымі кампануеш, — сказаў яму Тамаш, — сталы ты хлапчук. Гаспадар з цябе добры павінен быць. Спакойны ты хлопец… Шкадуеш мамы?

— Шкадую.

— Нудзіш?

— А-ей як.

— Нічога, сынку, пераживецца. Выгадуешся, падрасцеш, будзеш жыць. Лепш будзеш жыць за нас усіх.

Адну з галоўных біблейска-хрысціянскіх ісцін нагадвае нам і сучасны паэт: «Не срэбра шчырае — шчырае слова // Галоўны скарб наш у свеце часовым» (Р. Барадулін). Добразычлівае слова ацаляе, дапамагае, ратуе. У чорнаўскім рамане гучыць вельмі слушная думка: «Што чалавеку трэба? Чалавеку трэба, каб душа была на месцы, от што яму трэба. Калі ў чалавека душа на месцы, тады і свет яму міл». Вось пра такое ўнутранае дзіцячае самапачуванне і хваляваўся Кузьма Чорны, які добра ведаў, як шмат значыць у жыцці малога чалавека душэўны спакой і лагода. Усім лірыка-драматычным пафасам твора пісьменнік надзвычай пранікнёна даводзіў, што дзяцінства і смерць — несумяшчальныя, узаемавыключальныя рэчы-з'явы.

Маці і дзіця ў чорнаўскім светаразуменні — адно непадзельнае жыццёвае і духоўнае цэлае. Глыбока і моцна спалучана мацярынскае сэрца з дзецьмі. Усе думкі і клопаты пра іх прасякнуты пачуццём шчырага хвалявання і неспакою. Да апошняга свайго ўздыху мацікутніца застаецца адданай дзецям. Наталя менш за ўсё дбала пра сябе, маркоціцца, што «згубленага здароўя не вернеш». Жанчына-маці ўсведамляе, што яе жыццё патрэбна сям'і і дзецям, без яе цяжка будзе ім узняцца «як мае быць… на ногі». Яна вельмі шкадуе малога Юрку, хвалюецца пра сіроцкую долю сына і яго будучыню: «Адчуваючы слабасць, яна драмала і ўсё думала. Вострая ўзбуджанасць дума не давала ёй забыцца на ўсё ў моцным сне. Юрка стаяў уваччу яе, з чорнымі і нямытымі нагамі, сінявокі, шыракатвары, малы». Наталя — сялянка-працаўніца і маці-ахвярніца, яе вобраз вельмі зямны і разам з тым велічны ў сваім трагізме. Як не схіліць галаву перад гэтай простай вясковай жанчынай! Маці ў вачах сына паўстала ў сваёй незвычайнасці, яна нібы святая: «І раптам Юрка ўбачыў: на покуці, непрывычна чыста адзетая, вялікая нейкая, белая, незнаёмая ляжала маці». Хлопчык кідаецца ў ногі памерлай маці — і ў гэтым парыве выяўляецца ўвесь яго дзіцячы боль і адчай.

Вясковае дзяцінства ў рамане «Зямля» немагчыма ўявіць без паказу прыроды, дачыненняў юных герояў з лесам, полем, ракою і ўсім навакольным светам. Лірычна-паэтычныя апісанні краявідаў складаюць у тэкставай прасторы значную частку, у сукупнасці яны ствараюць вобраз роднай зямлі як жывога дзейнага героя. Адухоўленая сувязь з прыродай выяўляецца аўтарам пастаянна, на працягу ўсяго рамана: «Нявыказаная воля душы ўзбуджвалася прасторамі паплавоў і поля, густою жаўцізною пахучых кустоў. І ўсё пахла востра і шырока. І ўсё калацілася незвычайнай чуласцю ва ўспрыманнях»; «Яны ішлі кустовою дарогаю. Крушына і алешына абсыпалі іх багаццем жоўтага багацця свайго. Лісце на дубовых кустах трымалася яшчэ моцна. За кустамі журылася поле; іржышча і ралля межаваліся з чырванаватаю жытняю рунню»; «Збіралася ўміраць восень! І ў павольным сканашні яе хваляваліся буры і кіпелі імкненні. І ў пажоўклай траве была радасць гэтых і ўсякіх дзён; жыла і кіпела — у пахучай зямлі, у каменнях, у лісці». Пейзаж у большасці выпадкаў тонка суаднесены аўтарам з рухам жыцця персанажаў, у тым ліку і дзяцей, іх унутраным светаадчуваннем. Пісьменнік часта паказвае чаргаванне вобразаў роднага ўлоння і змену прыродных станаў. Зямля і неба, дрэвы і кветкі, дарога і поле, восень і зіма, вечар і раніца, цяпло і холад — усё гэта складае асяродак жыцця чорнаўскіх герояў, у якім яны існуюць у штодзённых клопатах і працы, сустракаюцца і ладзяць стасункі, гутараць ці проста бавяць час. Прырода больш чым фон, карціны і малюнкі роднага наваколля — неад'емная частка духоўнага свету дзяцей і дарослых, гэта тое, што з малых год па сутнасці фарміруе іх характар, ментальнасць, закладвае ў юнай асобе пачуццё прывязанасці да роднай зямлі, радзімы.

Героі пісьменніка з дзяцінства арганічна ўлучаны ў штодзённы сялянска-побытавы лад жыцця, прыродна-землеробчы колазварот часу. Юрка і Юзік, можна сказаць, прыродныя дзеці, яны гадуюцца на ўлонні маляўнічых мясцін.

Родная прырода штодня побач з імі, атуляе і загартоўвае іх. Аўтар заўважае: «Вецер... абвяваў Юркаў твар, прывыклы да ўсялякіх ветраў і дажджоў». Можна сказаць, Юрка — дзіця прыроды, яе гадаванец. Чорнаўскі герой-падлетак існуе ў цеснай душэўнай лучнасці з навакольным светам. Хлопчык жыве сярод родных краявідаў, бачыць іх ціхае і непаўторнае хараство, рэагуе на розныя навакольныя з'явы, прыродныя змены, водары і пахі. Прыродзе, нібыта маці, ён давярае самае таемнае. Сузіранне краявідаў абвастрае пачуцці-перажыванні хлопчыка: «Юрка глядзеў на чорную раллю за паплавамі, гладкую і не ўкрытую яшчэ першымі ўсходамі жыта, падышоў паплавамі да вузкай і чыстай рэчкі і раптам заплакаў». Псіхалагізаваныя пейзажы выяўляюць чуласць, непасрэднасць і паэтычнасць дзіцячага светаўспрымання.

Эмацыянальны свет падлетка Юркі фарміруецца праз далучанасць да ўсяго існага і жывога. У атмасферы працоўных сялянскіх заняткаў, праз унутрысямейныя стасункі і ўспрыманне розных з'яў назапашваецца жыццёвы вопыт і ўнутраны патэнцыял асобы будучага дарослага чалавека. Вельмі яскрава выспяванне глыбока чалавечнай свядомасці, этычна-гуманнага светапогляду паказваецца аўтарам рамана на прыкладзе стаўлення Юркі да каня як жывой істоты. Хлопчык успрымае гэтага састарэлага працаўніка як неад'емную частку свайго жыцця і ўсёй іхняй сялянскай сям'і. Былы дбайны памочнік страціў ранейшую сілу, стаў бездапаможным, а таму цяпер ён ужо непатрэбны свайму гаспадару. У Мацвея, бацькі хлопчыка, дамінуе чыста практычнае, прагматычнае стаўленне да жывёлы, адсюль і яго пагардлівая злосць, грэбліва-чэрствае стаўленне да каня, які вычарпаў свой працоўны рэсурс. У Мацвеевага сына-падлетка абуджаецца абвостранае адчуванне іншага жыцця, чула-спагаднае шкадаванне нямоглай істоты. Дзіця — быццам маральнае люстэрка для апраўдання бацькі. Хлопчык бярэ ў сваё маленькае сэрца чужы боль і бяду, здаецца, да нас звяртаецца жывое чалавечае сумленне: як можна жорстка абыходзіцца з тым, хто штодня быў памочнікам, рваў жылы, ахвяруючы дарэшты свае сілы на жыццё і карысць тваёй сям'і?! Юрку прыгнечвае шчымлівае пачуццё віны ад усведамлення сваёй немагчымасці чым-небудзь дапамагчы каню перад скананнем. Нічога не паробіш, бо існуе адзіны няўхільны закон прыроды: наканаванасць знікнення ўсяго жывога на зямлі. Перад наступствам смерці хоць на пэўны час ратуе любоў і шкадаванне. І гэта ледзь не інтуітыўна адчувае дзіця ў адносінах і да хворай маці, і да занапалага каня-гаротніка. Уражлівая натура, Юрка бароніць бедную жывёліну ад жорсткасці хлопцаў, своечасова гукае на помач Юліка Барановіча ў той момант, калі конь канаў, «стагнаў і качаўся». Як бачым, Кузьма Чорны, параўноўваючы дарослы і дзіцячы погляды на свет, па сутнасці супрацьпастаўляў утылітарна-прагматычнае і душэўнае, жорсткае і чалавечнае, завастраў праблему фарміравання ў сялянскім асяродку маральна чулай, гуманнай асобы. Пісьменнік хваляваўся пра тое, якім будзе гадавацца і як будзе пераўтварацца з ранніх гадоў чалавек, бо ад гэтага, уласна кажучы, залежыць этычны стан і духоўны прагрэс беларускай вёскі. Кузьма Чорны ацэньваў тагачасную рэчаіснасць і супольнасць людзей, якія жывуць і працуюць на зямлі, вачыма дзіцяці, з пазіцый дзіцячага светаадчування — непасрэднага, даверлівага і далікатнага.

Вобраз Юркі — гэта чорнаўская мадэль героя пераважна з унутраным, інтравертным характарам. Пісьменнік прадэманстраваў глыбокае адчуванне і вымярэнне дзіцячай псіхалогіі: «...І раптам твар яго загарэўся вастратою чалавечых глыбінь. Недзіцячым на некалькі момантаў зрабіўся гэты твар»; «Недзіцячы бляск раптам з'явіўся ў Юркавых вачах. Вострым агнём загарэліся яны... Так ён стаяў, шчуплы і ўзбуджаны, поўны немымі бурамі». Юрка — яшчэ зялёны падлетак, сарамлівы і самотны, але разам з тым жыццё робіць яго не па гадах сталым, дарослым. У яго душэўным свеце віруюць думкі, уздымаюцца буры-пачуцці. Ранняе, дачаснае сталенне напаткала чорнаўскага героя. Спасцігаючы свет пачуццяў і перажыванняў дзіцяці, пісьменнік імкнуўся намацаць і зацвердзіць асноватворныя маральна-каштоўнасныя якасці паўнавартаснай чалавечай асобы.

Значнае месца ў рамане займае паказ сяброўства і ўзаемаадносін Юркі і Юзіка. Яны абодва гадуюцца напаўсіротамі, працуюць і дапамагаюць па гаспадарцы, аднак, надараецца, бавяць час разам. Асабліва прыкметную ролю ў раскрыцці іх душэўнага сумоўя і сяброўскіх стасункаў адыгрываюць дыялогі. Пісьменнік дае нам магчымасць паслухаць іх думкі і развагі, з якіх мы даведваемся, чым падлеткі жывуць і як ладзяць між сабой, пра што мараць, кім хочуць стаць у дарослым жыцці. З гутаракдыялогаў вымалёўваюцца рысы характару хлопчыкаў, іх настроі і душэўныя перажыванні. Аўтар так кажа пра іх сяброўскую паяднанасць і душэўную патрэбу быць разам: «Селі на парозе, гаварылі пра ўсё, што пападалася толькі на вочы і ўзыходзіла на думку. І не хацелася ім нікуды адсюль ісці, як бы гэта тут знайшлі яны для сябе пачаткі ўсяго, чым

жывуць яны». Сяброўства Юркі і Юзіка — шчырае, даверлівае, кранальнае.

У рамане «Зямля» дзяцінства — адмысловы свет жыцця, аднак ён не існуе неяк аўтаномна, ізалявана. Дзеці і падлеткі прылучаны да жыццёва-працоўных клопатаў дарослых, спалучаны з іх доляй.

Дзяцінства, на думку Кузьмы Чорнага, адзін з важных і ў многім вызначальных этапаў у жыцці чалавека. У сталых герояў пісьменніка з ім звязваецца ўспамін пра штосьці шчымліва-незваротнае, няспраўджанае. Да свету дзяцінства вяртаецца ў думках і згадках Леапольд Гушка, герой рамана **«Бацькаўшчына»** (1931). Ён гаворыць: «Я памятаю, я ўсё гэта як бачу, як ясны сон бачу, калі маці мяне малога павяла за руку была ў той апошні дзень пад той касцёлак... Можа, каб я вярнуўся туды... можа б, іначай я пражыў жыццё сваё, не гэтак, як тут жыў, можа б, іншаю шчасліваю сцежкаю дайшоў да труны свае». Дзяцінства, як лічыць пісьменнік, прысутнічае ці праяўляецца ў чалавеку як надзвычай важная рыса. Дзіцячы вобраз — гэта своеасаблівая маркіроўка сапраўднага і каштоўнага ў абліччы героя: «Антусь і Марылька — усе дзеці яе зліваюцца з вобразам Адася. Два вобразы аднаго чалавека. Адзін вобраз — пакутны позірк нявіннага дзіцяці з матчынаю калыханкаю над ім, другі вобраз — моцны чалавек, які адной рукою можа абараніць сваю старую немагушчую маці ад усялякага гора, якім повен свет». Стаўленне да дзіцяці — праява чалавечага пачатку ў душы чорнаўскіх герояў. Убачанае палонным немцам Эдвардам Лявэрам дзіця ў беларускай хаце выклікае ў яго пачуццё раптоўнага замілавання і радасці: «Тады вочы яго пачырванелі, ён захваляваўся, пачаў растлумачваць, што як ішоў ён ваяваць, дык якраз гэтакае малое дома пакінуў». Бацькоўскае хваляванне пра сваё дзіця ці дзяцей прадвызначала псіхалогію паводзін чалавека на Першай сусветнай вайне. Вайна — вораг сям'і, бацькоўства, звычайных салдат. Эдвард Лявэр думкай і сэрцам прыкаваны да сваёй абяздоленай сям'і, прызнаецца, што ён і такія, як ён, не хочуць гінуць і здаюцца ў палон, каб не пакінуць сіротамі ўласных дзяцей. Смерць бачыцца палоннаму немцу бессэнсоўнай, імкненне выжыць, захаваць сябе цалкам матывавана і апраўдана, бо сям'я, дзеці — гэта самае дарагое і каштоўнае, што ў яго ёсць.

Кузьма Чорны досыць часта звяртаўся да дзіцячых гадоў персанажа з мэтай стварэння агульнай ідэйна-мастацкай канцэпцыі героя ці характару. Дзяцінства — нібы своеасаблівы навігатар у свет жыцця і поглядаў дарослага чалавека. Разглядаючы ранні ўзрост у кантэксце канцэпцыі асобы, А. Белая адзначае: «Дзяцінства — гэта пара набыцця індывідуальнага, часам негатыўнага, жыццёвага вопыту. ...Фармальная адсутнасць ідэалізацыі дзяцінства на самай справе азначае яго аб'ектыўнае эстэтычнае спасціжэнне, сведчыць пра цікавасць пісьменнікаў да псіхалогіі канкрэтнага, сапраўднага дзіцяці» [3, с. 154, 171]. Кузьма Чорны не ідэалізаваў дзяцінства ва ўмовах панавання суровых і жорсткіх законаў жыцця, існавання сацыяльнай дысгармоніі, класавага размежавання людзей на паноў і парабкаў. Новая эпоха і спароджаная ёй грамадская перабудова ў савецкі час змусілі пісьменніка паглыблена асэнсаваць лёс учарашніх дзяцей вёскі і беларускага мястэчка, адшукаць і зразумець вытокі пэўнага менталітэту і псіхалогіі чалавека. З аднаго боку, селяніна, парабка, бяспраўнай жанчыны, а, з другога, — чалавека-ўласніка. Чорны, апавядаючы гісторыю канкрэтнага героя, вяртаўся да дзіцячага перыяду жыцця, рабіў экскурсы да ўмоў сталення і выхавання, пры якіх закладваліся псіхалагічна-свядомасныя асновы характару чалавека, яго погляды і адносіны да з'яў рэчаіснасці, іншых людзей, сям'і, побыту, каштоўнасцей і г. д. Вельмі паказальным у гэтым плане з'яўляецца раман **«Трэцяе пакаленне»** (1935). Пастушок Міхалка пераймае жыццёвую філасофію старога хутаранца Скуратовіча, які навучае: «Тое, што ты маеш, людзям не паказвай, бо адбяруць. ...Трымай пры сабе і свае думкі і ўсё, што маеш... Кожны стараецца, каб сабе ўварваць, а ні то што! Хто сталы і разумны, той скупы і на слова, і на ўсё. Усё сваё ён пры сабе трымае». Аднак уласніцкі пачатак, можна сказаць, закладзены ў самой чалавечай прыродзе. Гэта выяўляецца ў паводзінах і намерах Міхала Тварыцкага. Ён, спазнаўшы бядняцкую долю, не жадае пакутаваць праз голад і галечу, а таму хоча разбагацець, мець дастатак. Таму зразумела, чаму хлопчык мусіць дагаджаць заможнаму Скуратовічу, хітраваць. У сталыя гады Міхал жыве дзеля сям'і, высільваецца ў працы дзеля будучыні сваёй адзінай дачушкі Славы. З малых гадоў працавала на хутары і жонка Тварыцкага — Зося. Аднак яна, у адрозненне ад Міхалкі, па-дзіцячы адкрытая, непасрэдная, нават наіўная, яна пазбаўлена карыслівага разліку. У натуры гэтай дзяўчынкі-парабчанкі існавала імкненне да шчырасці і праўды, пачуццё абвостранай справядлівасці. Зося-падлетак сказала Назарэўскаму пра схаванае Скуратовічам збожжа. Пазней яна выдае свайго мужа Міхала, які знайшоў украдзеныя

грошы і схаваў іх. Абое героі — Міхал і Зося — не ідэальныя, цяжкае дзяцінства адбілася на лёсах гэтых людзей, стала ў многім прычынай іх адрознага стаўлення да жыцця і адно да аднаго. Пісьменнік нічколькі не памыляўся, што пэўны асяродак і пэўная жыццёвая школа з ранняга дзяцінства самым істотным чынам уплываюць на фарміраванне будучай асобы. У адным з незакончаных твораў Кузьма Чорны, апавядаючы пра лёс абяздоленага хлопчыка-падлетка, піша пра яго з вялікім спачуваннем: «...але што жыць на свеце цяжка, гэта дзіця ведала лепш ужо за самага спрактыкаванага старога» («Тоня»).

Вобразы дзяцей нямала дадаюць да разумення канцэпцыі чалавека, рэчаіснасці і часу ў рамане «Сястра» (1927—1928), аповесцях «Лявон Бушмар» (1929), «Люба Лук'янская» (1936) і інш. Пісьменнік любіць узнаўляць дзіцячае маўленне, размовы дзяцей і дарослых, выяўляць тое, што поўніць дзіцячую істоту, аналізаваць і раскрываць, што дзеецца ў думках малога чалавека ў той ці іншы момант. Пісьменнік тонка перадае мацярынскія адчуванні і хваляванні, паказвае, як шмат значыць для жанчыны быць маці і гадаваць дзіця (ці дзяцей).

Трагедыя дзяцінства ў гады Вялікай Айчыннай вайны паўстае з мастацкай прозы і публіцыстыкі Кузьмы Чорнага. Разам з сям'ёй ён мусіў пакінуць ахоплены полымем Мінск. Ратаваў дачку Рагнеду і чужых дзяцей, якіх напаткаў гэткі ж трагічны лёс выгнаннікаў і бежанцаў. Пісьменніка надзвычай моцна ўзрушыла гібель мноства людзей, у тым ліку дзяцей. Ён стаў сведкам злачынстваў фашыстаў супраць дзяцінства і чалавечнасці, пра што гаворыць у артыкулах «Народная нянавісць», «У імя будучыні», «Будзем адзінадушнымі і непахіснымі» і інш. Гібель дзяцей для Кузьмы Чорнага — самая страшная катастрофа гуманізму. Ён, памятаючы пра гуманітарныя наступствы ранейшых ваенных канфліктаў, з болем адчуў і зразумеў, што дзеці на гэтай новай вайне — самыя нявінныя і безабаронныя ахвяры. Кузьма Чорны казаў пра жахлівую смяротную пагрозу жыццю і будучыні дзяцей: «І адразу раптоўна паўстала перад нявінным дзіцём змрочная постаць азвярэлага чужынца» («У імя будучыні»). Гэтак, як і Ф. Дастаеўскі, беларускі пісьменнік блізка да сэрца прымаў гора і слёзы дзяцей, не знаходзіў апраўдання бесчалавечнасці і жорсткасці.

Кузьма Чорны пабачыў «крывавую драму» дзяцей пад бамбёжкамі фашысцкіх самалётаў, і як вынік гэтага — глыбока эмацыянальная рэакцыя на падзеі, этычна-ацэначны характар думкі, якая асуджае агрэсію, захопнікаў і іх злачынствы. Трагічны лёс і паводзіны дзяўчынкі-падлетка ва ўмовах смяртэльнай небяспекі апісваюцца ў артыкуле «Народная нянавісць» (1941), а крыху пазней знайшлі мастацкае ўвасабленне ў апавяданні **«Маленькая жанчына»** (1942). Сама яшчэ невялікага ўзросту, па сутнасці дзіця, яна пад уплывам ваенных абставін, бяды і чалавечага гора раптоўна становіцца дарослай, непазнавальна мяняецца за некалькі першых дзён вайны. Гэта ўжо «маленькая жанчына». Асіроцелая дзяўчынка апякуе меншых дзяцей-сірот, з якімі ратуецца ў бежанстве. У апавяданні пісьменнік звяртае ўвагу на змены ў яе вобразе — перад намі «жывое ўвасабленне самай закончанай супрацьлегласці ёй самой, якая яна была яшчэ некалькі дзён таму назад». З апавядання паўстае дэталёва выпісаны вонкавы і псіхалагічны партрэт «маленькай жанчыны»: «Завостраныя плечы яе тырчалі ўгару, адно плячо трымалася вышэй за другое і раз-поразу ўздрыгвала. Чым больш яна стаяла тут, тым выразней сыходзіла з яго пячаць ранейшай цягавітай упартасці, і замест яе ажываў адчай». Гэтая «маленькая жанчына» церпіць у зямным пекле страшныя пакуты, ідзе праз нечалавечыя выпрабаванні. У яе мастацкім вобразе справядліва ўбачылі рысы Мадонны — Мадонны часу вайны, якая з'явілася, каб прытуліць, прыгарнуць да сябе няшчасных малых дзяцей і абараніць іх ад сусветнага зла. У апавяданні «Маленькая жанчына» пісьменнік выразна сфармуляваў сваю гуманістычную пазіцыю адносна праблемы вайны і дзяцінства. Гэта глабальная праблема агульначалавечай значнасці, і бачыцца яна ва ўсёй супрацьлегласці і трагічнай несумяшчальнасці двух станаў, двух светаў. Жыццё дзіцяці пісьменнік ставіць вышэй за ўсё, таму смерць і гібель дзяцей, на яго думку, павінны ўсведамляцца як жах і найвялікшая катастрофа. Ён з гуманістычнай палымянасцю заклікае да ўсведамлення віны і пакаяння: «Каб увесь свет, як вялік ён ні ёсць, ад усіх сваіх пачаткаў і бязмежнасці сабраўся і ажыў, як вялікая істота, з вачыма, каб бачыць, з вушыма, каб чуць, з душой, каб адчуваць, з розумам і думкамі, — сумленне кінула б яго ніц перад гэтым дзіцем». Апавяданне «Маленькая жанчына» — гісторыя пра адабранае, страчанае дзяцінства ў гады вайны. Кузьма Чорны паказвае, што сіроцтва, заўчаснае сталенне і «сталасць на доўгі век» — суровая наканаванасць дзіцячага лёсу ва ўмовах ваеннага ліха.

Тэма ваеннага дзяцінства раскрываецца ў розных трагічных аспектах таксама ў

апавяданнях «Бацька» (1942), «Матчына кроў» (1943), «Вялікае сэрца» (1944) і інш. Пісьменнік паказвае, што акупацыя Беларусі ўяўляла сабой змаганне з учарашнімі мірнымі жыхарамі і малымі дзецьмі. Учынкі і дзеянні акупантаў — жорсткія, брутальныя. Гітлераўцы і паліцаі праз забойствы імкнуліся запалохаць людзей, прымусіць іх скарыцца новай уладзе. Нясцерпны боль-адчай працінае маці, у якой загінулі дзеці. Яна так кажа пра сябе: «Няшчасная маці, у якой гітлераўцы забілі дзяцей. Божачка мой, літасцівы мой!» («Вялікае сэрца»). Аднак смерць дзяцей выклікае найбольшы пратэст, спараджае гнеў «супраць звера». «Наш Юрась адпомсціць за Настачку. У яго руках зброя», — выкрыквае маці, на вачах якой гітлеравец забівае яе дачушку («Бацька»). Вайна не шкадуе ні дзяцей, ні дарослых, яна — суцэльная бяда, няшчасце і пакуты. Кузьма Чорны разумеў увесь маштаб трагедыі дзяцінства і ўсведамляў, што надта дарагая цана за перамогу, на алтар якой ускладзена мноства дзіцячых жыццяў. Заставалася шмат малых і юных бязбацькавічаў, напаўсірот і круглых сірот «напроці свайго веку». Кузьма Чорны не сумняваўся ў адным: трэба перамагчы фашызм, цемрашальства і ваяўнічае зло дзеля жыцця, будучыні сваіх дзяцей і нашчадкаў. Ён верыў, што заўтрашні дзень — мірны, без вайны і калатнечы — за дзецьмі, час працуе на новыя пакаленні, хоць прадчуваў, што шлях да светлага, шчаслівага заўтра будзе нялёгкі. Чорнаўскі аптымізм выяўляецца ў словах, адрасаваных Колю Сушчэвічу, для якога вайна пачалася, калі ён быў яшчэ зусім малы: «Спадзявайся на заўтрашні дзень. Ты яшчэ дзіця. ...Ідзі ў заўтрашні дзень так, як і дагэтуль ішоў» («Заўтрашні дзень»).

Для Кузьмы Чорнага гэтак, як і для Ф. Дастаеўскага, дзіця — найвышэйшая каштоўнасць, роўная Богу, само сумленне — шчырае, трапяткое, балючае. Нездарма ўсе дарослыя героі рамана **«Млечны Шлях»** (1944) спавядаюцца перад дзяўчынкай Ганусяй — нібы перад святой. Яе вобраз узвышаецца ў творы да сакральнага вобраза-сімвала беларускай Мадонны. У Бібліі дзіця разглядаецца як увасабленне анёльскай чысціні і нявіннасці. Святое Пісанне папярэджвае: «Калі... не будзеце як дзеці, то не трапіце ў Царства Нябеснае» (Мф. 18:3). Ф. Дастаеўскі быў перакананы, што без дзяцей немагчыма палюбіць чалавецтва, ён казаў, што «дзяцей нельга не любіць. Ды і як не любіць іх? Калі ж перастанем дзяцей любіць, то каго ж пасля гэтага мы зможам палюбіць і што будзе тады з намі самімі?» [4, с. 175]. Дзіця ўспрымалася і Дастаеўскім, і Чорным як увасабленне маральнай чысціні, дабрыні і чалавечнасці. Адносінамі да дзіцяці беларускі пісьменнік правяраў грамадства і час на трываласць гуманістычных каштоўнасцей.

Дзіця і дзяцінства — галоўны крытэрый у рамане **«Пошукі будучыні»** (1943). Крытэрый сутнаснага вымярэння часу, ваеннай рэчаіснасці, чалавечага быцця. Вайна ўспрымаецца пісьменнікам як антыпод дзяцінства. Назва першага раздзела рамана «Украдзенае маленства» набывае сімволіка-абагульнены сэнс. З гэтым загалоўкам кантрастуе эпіграф з Бібліі: «Пладзецеся і размнажвайцеся, і напаўняйце зямлю...». Адразу ўзнікае пытанне: а дзеля чаго дзеці нараджаюцца і напаўняюць свет? Зразумела, не для таго, каб быць пазбаўленымі маленства і шчаслівых дзён жыцця. Віталістычнай біблейскай канцэпцыі ў сэнсава-сімвалічным плане супрацьпастаўляецца трагічная тэма ўкрадзенага маленства.

Ужо на першай старонцы твора трагічна завастраецца думка пра тое, што ў дзяцей ёсць нядобразычлівец ці вораг: нехта ж украў маленства! Хто ён, той хцівец? Або што гэта за сілапраява, якая крыўдзіць дзіця, пакідае яго без маленства? Адказ на гэтае пытанне вынікае са зместу і пафасу твора: вайна гвалтоўна перапыняе і забірае дзяцінства. Кузьма Чорны імкнуўся знайсці адпаведны мастацка-філасофскі вобраз страшнай, д'ябальскай сілы, якая разбурае чалавечы свет і выкрадае ў дзяцей будучыню. Гэта адпаведнік ідэалогіі ваяўнічага зла, гвалту, бесчалавечнасці. Пісьменнік увёў у сюжэтна-кампазіцыйную структуру твора вобраз-сімвал Вялікага злодзея і надаў яму ў ідэйным змесце надзвычай важнае сэнсаваўтваральнае значэнне. Слушна заўважана, што Кузьма Чорны стварыў гэты вобраз па аналогіі з Вялікім інквізітарам у «Братах Карамазавых» Ф. Дастаеўскага. Атрымалася своеасаблівая алегорыя прытчавага характару. Неаднойчы беларускі пісьменнік робіць сэнсава-кульмінацыйную акцэнтацыю на негатыўным, дэструктыўным вобразе злаліха. Напачатку аўтар гаворыць пра злавесна-таямнічую сілу, варожую дзяцінству: «Хтосьці злы адабраў ад яго яе маленства»; «Нехта злы і бязлітасны ўкраў у яго яе маленства». Затым пачынае вымалёўвацца вобраз гэтага зламысніка-пачвары: «Тамашова маленства ўкралі ад бацькі: жалезная нага таго страшнага злодзея зноў душыла Сымона Ракуцьку»; «Люты звер, што сеў цяпер жалезным азадкам на галаву нашу...». Пісьменнік персаніфікуе і міфалагізуе зло ў звярыным, жалезным абліччы. Жалезны звер выклікае біблейскія алюзіі. Гэта бітва-змаганне архангела Міхаіла і анёлаў з д'яблам-змеем, які,

пагражаючы жанчыне, хоча зжэрці яе народжанага сына. Згадваецца таксама вайна з цмокамзверам у «Апакаліпсісе» Іаана Багаслова.

Вайна ўспрымалася пісьменнікам як апакаліптычная катастрофа, глабальная трагедыя гуманізму, калі сутыкнуліся ў сваёй непрымірымасці антаганістычныя сілы: звярыная і чалавечая. Сусветнае зло палохала жывое ўяўленне пісьменніка. Яно выйшла на паверхню ў абліччы Вялікага злодзея — ворага дзяцей, інквізітара жыцця і ўсіх чалавечых каштоўнасцей. Лейтматывам праз твор праходзяць словы аўтара і герояў пра сутнасць гэтага міфалагізаванага персанажа, які з'яўляецца збіральным, канцэнтраваным увасабленнем злавеснага ліха-бяды, д'ябальскага наслання: «Страшны смутак здушыў яму душу. Тады страшны злодзей украў у яго Волеччына маленства»; «Можа ўжо зноў тут блізка ходзіць той вялікі злодзей, што ўкраў у яго Волеччына маленства?!»; «...страшны злодзей зноў з'явіўся і адрывае ад душы жывасілам усё, чым жыве душа. Зноў пустошаць душу! Забіваюць душу! Абкрадаюць! Жывяцца чужой душой і жыццём яе!». І гэта не страшная-страшная казка, а жахліва-жудасная рэальнасць ваеннага часу. Як бачым, у розных варыяцыях паўтараецца думка пра жорсткую сутнасць і злавесныя дзеі гэтага ўсёмагутнага жалезнага персанажа часу і гісторыі — па сутнасці дэмана-монстра. Вялікі злодзей хоча загубіць свет дзяцінства, знішчыць чалавечае ў чалавеку, усталяваць на зямлі ваўчыныя драпежніцкія законы і прывесці людзей да апакаліптычнага фіналу. Пад пагрозай апынулася будучыня дзяцей, лёс цэлага народа і ўсяго чалавецтва. Вобраз Вялікага злодзея можна наўпрост звязваць з дэманічнай асобай Гітлера, кіраўніка нацысцкай Германіі: менавіта ён стаў увасабленнем той сілы зла, якая прынесла на беларускую зямлю гібель дзяцей, сіроцтва, мацярынскія слёзы і пакуты. Кузьма Чорны канстатуе: надышлі «ганебныя чалавецтва дні». «Дык хто ж тады будзе жыць, калі жыццё змарнуецца?» — так завастрае ён пытанне, разважаючы пра будучыню ў яе часавай перспектыве. Пісьменнік глыбока ўсведамляў патрэбу народнага і ўсечалавечага супрацьстаяння фашызму з яго чалавеканенавісніцкай ідэалогіяй. Неабходна прагнаць злодзея-рабаўніка са сваёй тэрыторыі, забяспечыць дзецям мірнае неба над галавой. Толькі мужная, бязлітасная барацьба здолее прынесці жаданы вынік — «сцерці з твару зямлі такую погань, якая ў нашы дні ў вобразе Гітлера заявіла, што нармальны стан мужчыны быць у вайне». Кузьма Чорны заваёўніцкай дактрыне, чалавеку вайны проціпастаўляе мірны, нармальны стан штодзённага жыцця, пры якім у чалавека на першым плане — жаданне мець шчасце ў сям'і, гадаваць сваіх дзяцей, клапаціцца пра іх будучыню, цешыцца з таго, чым адорвае Бог, зямля і праца на ёй. Пісьменнік засцерагаў ад дэгуманізацыі, маральнай дэградацыі і асобнага чалавека, і ўсё чалавецтва, «вялікі свет». Чалавек-звер у абліччы чужынца-заваёўніка — вось рэальны вораг дзяцінства і нацыянальнай будучыні.

У «Пошуках будучыні» выяўляецца аўтарская гуманістычная, хрысціянская ў сваёй аснове, канцэпцыя чалавека, добрага і міласэрнага па сваёй прыродзе: «Вырві ты з чалавека сэрца і ўстаў на яго месца звярынае, дык у чалавечых грудзях і звярынае сэрца стане чалавечым». Меў рацыю А. Адамовіч наконт аўтарскай канцэпцыі, увасобленай у творы: «Чалавек, які перастае быць чалавекам, становіцца горшым за звера — вось думка, якая пранізвае раман» [1, с. 167]. Кузьма Чорны ненавідзеў звярына-жорсткае ў чалавеку і носьбітах фашысцкай ідэалогіі. Ён палымяна асуджаў тое, што ствараецца геніямі дзеля смерці чалавека, і ўзвышаў гуманістычны ідэал дзяцінства, менавіта тое, што робіцца з думкай і клопатам пра дзяцей. Ф. Дастаеўскі лічыў, што нават шчасце ўсяго свету не каштуе слязінкі на шчацэ дзіцяці. Для Кузьмы Чорнага дзіцячая ўсмешка — сімвал надзеі на зямное чалавечае шчасце. У рамане гэта ўсмешка дзяўчынкі Лізаветы, якая ў асацыятыўным плане нагадвае леанардаўскую Мону Лізу. Сляза і ўсмешка — два адрозныя бакі канцэпцыі дзяцінства. Кузьма Чорны катэгарычна не прымаў трагічнай наканаванасці дзіцячага лёсу праз вар'яцтва свету. Кузьма Чорны гаворыць, што пазбаўленне права на дзяцінства — рэч анамальная і недаравальная. Дзіцячыя пакуты — гэта рахунак чалавечаму сумленню, дакор дарослым людзям і ўсяму чалавецтву: «...Ад год той, першай за нашу памяць вайны з немцамі і да дзён нашых, сённяшніх, калі ўжо вырысоўваецца як бы канец і Вялікай Айчыннай вайне, за ўсю гэтую жорсткую эпоху, на мільёнах дзіцячых ілбоў мы бачылі і бачым маршчыну старасці». Такім чынам, у рамане «Пошукі будучыні» пісьменнік імкнуўся давесці, што чалавечае шчасце — зямное і простае, яно ў звычайным, у тым, што коратка называецца словамі сям'я, дзеці, жыццё.

У першым раздзеле Кузьма Чорны стварыў «адвечную песню» пра радзіму-бацькаўшчыну, зямное жыццё, еднасць чалавека і прыроды. На фоне ваенных падзей аўтар нібы вяртае нас да першароднасці свету, пракаветнага стану біблейскай цішыні: «Подых восені ціхай

задумёнасцю клаўся на поле, і ўдалечыні сіняя істужка лясоў здавалася разасланай цераз усю зямлю»; «Ужо вераснёвы вечар апаноўваў цішынёю свет»; «І зноў, як і тая ноч — з зорамі і цішынёй» і інш. На прыкладзе вобразаў дзяцей пісьменнік увасабляе ідэал пра гарманічнае, у сваёй аснове натуральна-прыроднае, быццё людзей на зямлі. Волечка Нявада і Кастусь Лукашэвіч — дзеці вайны, але разам з тым гэта і божыя дзеці, створаныя адно для аднаго і зусім для іншага — кахання, сям'і, захавання і прадаўжэння чалавечага роду. Вайна для гэтых падлеткаў — ненатуральны стан, цяжкае і суровае выпрабаванне, і яны разам ратуюцца ў гэты скрутны час. Лёс звёў гэтых падлеткаў пад адной страхой, паяднаў праз агульныя зямныя нягоды і сялянскія клопаты і, урэшце, знітаваў іх сэрцы праз шчырасць і глыбіню пачуццяў. Па сваім узросце Волечка Нявада і Кастусь Лукашэвіч яшчэ зусім дзеці, аднак яны быццам Адам і Ева на грэшнай зямлі часу вайны. Волечка і Кастусь працуюць як дарослыя і думаць, адчуваць пачынаюць як дарослыя, падаюцца нам сапраўднымі філосафамі. Гэта іх філасофія ідзе ад жыцця, іх зямной юдолі, лучнасці з прыродай, неабсяжным сусветам, усім існым. У жыццёва-драматычных абставінах яны страчваюць сваё дзяцінства, робяцца больш сталымі і дарослымі. Пісьменнік робіць ёмістую рэмарку: «Волечка маўчала, як самая сталая з усіх жанчын свету». Пра Кастуся Лукашэвіча заўважае: «Ворыва ж у яго ўяўленні заўсёды звязвалася з вобразам здаровага мужчыны». Разам з тым у душы і сваіх паводзінах чорнаўскія героі застаюцца дзецьмі — яны непасрэдныя і наіўныя, радуюцца і сумуюць, мараць і вераць у лепшае, адкрытыя свету і людзям, з чуласцю адгукаюцца на чалавечую бяду, ратуючы немца Густава Шрэдэра... Пісьменнік паэтызуе іх пачуццёвы свет, узвышае ў думках і памкненнях. Героі-дзеці ўвасабляюць пісьменніцкае ўяўленне пра чалавека — светлага, чыстага, прыгожага і боскага. У рамане «Млечны Шлях» Кузьма Чорны так гаворыць пра вайну, якая непазнавальна мяняе людзей і свет: «Брыдкі час, не варты чалавека. Чалавек не верыць сабе падобнаму». Пісьменнік нагадваў пра прыгожую боскую задуму чалавека, разважаў пра тое, як перайначыць яго мілітарызаваную псіхалогію і недасканалае існаванне, скіраваныя на самаразбурэнне. Давер да чалавека і вера ў чалавека — вось што галоўнае. «...Калі не верыць людзям, дык лепш тады ўжо на свеце не жыць», «Лягчэй памерці, чым астацца навек без веры і надзеі!» — даводзіць-пераконвае аўтар. Праз вобразы Волечкі і Кастуся пісьменнік паказвае, што «чалавек мае душу і сэрца», вяртае да ідэі зямнога жыцця і дзяцінства як боскага дарунку. Ён запрашае і заклікае зірнуць на хараство навакольнага свету і зорнага неба над галавой — і ў «Пошуках будучыні», і ў рамане «Млечны Шлях». Трэба, каб «душа... чула і вочы бачылі». Дык зірні на свет вачыма дзіцяці! Зірні дзеля таго, каб адчуць адвечнае прыцягненне роднай зямлі, сувязь з вышэйшым, боскім, духоўным. «Перад невядомасцю будучыні» Волечка і Кастусь імкнуцца для сябе і ўсяго чалавецтва адшукаць страчаны зямны рай. Яны — надзея на працяг жыцця, яны — вочы і жывая душа гэтай зямлі. Дзеці — жыццёвы грунт, духоўнае апірышча Беларусі, нацыі і яе будучыні.

Вельмі важнай у канцэптуальным разуменні ідэйнага зместу рамана з'яўляецца ідэя любові — любові да дзяцей, прыроды, бацькаўшчыны, роднай зямлі. Пачуццё замілавання і любасці ў творы Кузьмы Чорнага выяўляецца не столькі дэкларатыўна, колькі вынікае з унутранага пафасу апісанняў краявідаў, паказу адчуванняў герояў, аўтарскага лірызму. Здаецца, навакольны свет бачыцца пісьменнікам праз прызму дзяцінства і дзіцячага ўспрымання: «Сонца пабудзіла яго. Яно біла яму ў твар, але гэта было восеннае сонца, мяккае і лагоднае, як шчокі любага дзіцяці»; «Бо няма мне жыцця там, дзе не расце тая шыпшына, што ў маім маленстве цешыла мне вочы». Любоў Нявады да дачкі Волечкі, Сымона Ракуцькі да сваёй малой Лізаветы — выяўленне глыбокага пачуцця бацькоўскай любові.

Дзеці — сэнс жыцця, твая і агульная будучыня. Гэта і народная мудрасць, і глыбока ўнутранае перакананне аўтара рамана. Нявада, герой, духоўна блізкі аўтару рамана, прызнаецца: «Без Волечкі і без шыпшыны няма мяне і роднай бацькаўшчыны». Трэба так, як Нявада, аддаваць сваё сэрца дзецям, жыць, трываць цяжкасці, ісці праз пакуты дзеля іх. Кузьма Чорны гаворыць пра пачуццё любові як самае галоўнае, вызначальнае ў жаноча-мацярынскай існасці. Свет павінен скалануцца перад болем і адчаем жанчыны, якая крычма крычыць, бароняччы сваё дзіця. Мы чуем усхваляваны голас Маці-заступніцы, беларускай Мадонны на вайне, звернуты да ўсяго сумленнага людства: «Няшчасце! Бяда! Вялікае гора! Пагібель! Час той страшны настаў! Немец напаў! Б'е з неба і з зямлі, паліць, губіць... А хлопчык мой маленькі!..». Кузьма Чорны захапляецца ўсёабдымнай і ахвярнай любоўю Жанчыны-маці: «Жаночае сэрца робіцца вялікае, як свет, калі яно чуе боль знявечанага дзіцяці». Маці і дзіця — вось адзіны святы і непадзельны вобраз, перад якім пісьменнік пашаноўна схіляе галаву.

Лёс дзяцей у гады вайны асэнсоўваецца аўтарам рамана ў кантэксце зломнага гістарычнага часу і глабальных працэсаў. Кузьма Чорны мысліў нацыянальнымі і сусветнымі катэгорыямі, суадносячы Беларусь і чалавецтва, асобнае і агульназначнае. Беларускі народ і сусветная цывілізацыя, на думку Кузьмы Чорнага, апынуліся на вялікім скрыжаванні гісторыі. Апынуліся паміж горам і шчасцем, дабром і злом, быццём і небыццём, пеклам і раем, мінулым і заўтрашнім днём. Гэта мяжа экзістэнцыйнага, маральна-адказнага выбару шляху да будучыні. Для чалавека, народа, чалавечай цывілізацыі. Вуснамі свайго героя фельчара пісьменнік з упэўненасцю гаворыць: «Кожная дарога куды-небудзь вядзе, але ты выбірай тую, якая не вядзе ў прорву». Самае жахлівае — быць выгнаннікам на сваёй зямлі і не мець прытулку. Невыпадкова Кузьма Чорны вядзе сваіх герояў-пакутнікаў, скалечаных вайной і часам, да роднай хаты, да сваіх дзяцей, кутка маленства, да бацькаўшчыны. Шлях працілеглы ад ваеннай прорвы-пекла — да сямейнага, прыроднага, сялянска-зямнога раю. Кузьма Чорны гэтак, як і раней Янка Купала, Якуб Колас і іншыя яркія носьбіты ідэй гуманізму, «паказаў, якімі райскімі маглі б стаць штодзённыя сялянскія турботы, каб чалавецтва пайшло па шляху, пазначаным евангельскім маральным імператывам дасканалай любові» [5, с. 299—300). Трэба дадаць: турботы зямныя, сямейныя, жыццёва-чалавечыя. Кузьма Чорны разумеў, што ўкрадзенае маленства — цяжкая і глыбокая эмацыянальна-псіхалагічная траўма на ўсё астатняе жыццё: і для саміх дзяцей і для іхніх бацькоў. Цяжка будзе адшукаць суладдзе-гармонію ў чалавечай душы і сэрцы. Сіндром вайны, нянавісці і барацьбы — стан, які можна пераадолець, выціскаючы з сябе жорсткае, звярынае, нялюдскае: «Чалавек жа, нават і акамянелы, не бывае без сэрца». У абставінах трагізму часу і быцця важна адшукаць для наступных пакаленняў скрадзены, страчаны рай — дзяцінства. Каб жыў народ, Бацькаўшчына, «увесь свет». Уладзімір Ярмаліцкі з рамана «Млечны Шлях» пасля зведаных жахаў у канцлагеры ўсклікае: «Няхай жыве ўсясветная дбайнасць аб кожным чалавеку, які хоць дзе на зямлі радзіўся на свет. І чорнае пракляцце таму, хто паліць і разбурае!» Гэта чорнаўская гуманістычная канцэпцыя быцця актуальная і ў новым XXI стагоддзі і тысячагоддзі, бо на розных кантынентах свету выбухаюць і не сціхаюць войны, пад бамбёжкамі самалётаў і абстрэламі гармат гінуць дзеці. Людзей не спыняе нявінная сляза дзіцяці, трагічны вопыт многіх народаў, у тым ліку беларусаў. Чорнаўскія філасофскія канцэпты «ўкрадзенага маленства» і «пошукаў будучыні» могуць быць і сёння асновай пры вылучэнні гуманістычнай мадэлі чалавечага быцця як жыццёва важнай, надзённай, прыярытэтнай.

Такім чынам, дзяцінства — адна з галоўных і вызначальных тэм творчасці Кузьмы Чорнага. У даваенны час пісьменнік, шукаючы вытокі дзіцячай абяздоленасці, дзіцячага дачаснага сталення і жыццёвых ускладненняў, знаходзіў прычыны такога становішча ў сацыяльна-гістарычных умовах, грамадскіх супярэчнасцях (апавяданні «Начлег у вёсцы Сінегах», «Браты», «Дарагуся», «Сцяпанавы дзеці», раман «Зямля»). Ён актуалізаваў праблему маральнага развіцця і выхавання асобы (аповесць «Насцечка»). Кузьма Чорны выявіў сябе як глыбокі знаўца дзіцячай душы і псіхалогіі, паколькі тонка раскрываў асаблівасці дзіцячага ўспрымання і маўлення, дакладна і дасканала перадаваў рух думак, пачуццяў, настрояў сваіх герояў-падлеткаў.

У творах часу Вялікай Айчыннай вайны праз паказ трагічнага лёсу дзяцей і матыў украдзенага маленства пісьменнік паказаў разбурэнне жыццёва-зямнога ўладкавання свету, поўны крах каштоўнасцей гуманізму. Яго займала ідэя пошуку будучыні, якую ён справядліва звязваў з лёсам дзяцей. Кузьма Чорны стаў палымяным абаронцам дзяцінства ад ваяўнічага цемрашальства, фашызму з яго звярынай, антыгуманнай ідэалогіяй. Створаная ім дзіцячая карціна свету ў рамане «Пошукі будучыні» (сюжэтная лінія Волечкі і Кастуся Лукашэвіча) — мадэль сямейнага і сялянска-зямнога райскага жыцця. Прыродны, светлы дзіцячы пачатак супрацьпастаўляецца ўсяму звыродліваму, жорсткаму, нялюдскаму. Кузьма Чорны стварыў высокі сакральны, гуманістычны культ дзіцяці як першапачатку і першаасновы чалавечага быцця.

## Спіс літаратуры

1. *Адамовіч, А.* Шлях да майстэрства: станаўленне мастацкага стылю К. Чорнага / А. Адамовіч. — Мінск : Выд-ва АН БССР, 1958. — 180 с.

2. *Александровіч, С.* Слова — багацце : літ.-крытыч. арт. / С. Александровіч. — Мінск : Маст. літ., 1981. — 414 с.

3. *Белая, А. І.* Герой. Асоба. Характар: мастацкая персаналогія ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя : манагр. / А. І. Белая. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2012. — 517 с.

4. *Достоевский, Ф. М.* Полн. собр. соч. : в 18 т. / Ф. М. Достоевский. — М. : Воскресенье, 2004. — Т. 12. — 445 с.

5. *Конан, У.* Выбранае / У. Конан. — Мінск : Смэлтак, 2009. — 536 с.